**«ЖЫЦІЕ́ АЎРАМІ́Я СМАЛЕ́НСКА-ГА»**, агіяграфічны твор, помнік старажытнабеларускай л-ры. Напісаны ў канцы 1230 — пач. 1240-х гг. Аў-

й архив библиотеки МГУ имени А.

тар — вучань смаленскага прапаведніка, ігумена Багародзіцкага манастыра Аўрамія (каля 1146 — пасля 1219), настаяцель Рызапакладзенскага манастыра Яфрэм. У цэнтры жыццяпіса — вобраз ідэальнага героя-святога, які служыў у манастыры «во труде и во бдении, и во алкании день и нощь». Аўрамій маляваў абразы, перапісваў свяшчэнныя кнігі. Будучы ў Смаленску, праявіў сябе як чалавек высокай культуры, набыў папулярнасць сярод людзей. Далейшыя падзеі, звязаныя з выгнаннем Аўрамія з горада і канфліктам з духавенствам, Яфрэм тлумачыць выбрыкамі д'ябла. Нягледзячы на ганенне з боку зайздроснікаў, Аўрамій застаецца хрысціянінам, не адказвае злым на злое. Відавочна жаданне Яфрэма напісаць праўду пра свайго настаўніка, апраўдаць яго ў вачах нашчадкаў. Аўтар часта звяртаецца да аналогій з іншых жыццяпісаў (Іаана Златавуста, Антонія Вялікага і інш.), стварае своеасаблівы літ. партрэт Аўрамія, малюе праўдзівую панараму жыцця сярэдневяковага Смаленска. *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова